Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за верасень 2015 г.**

**<u>Мерапрыемствы ў рамках рэкламнага Тыдня “Бібліятэка XXI стагоддзя”</u>**

**07 верасня**

Гадзіна інфармацыі «Свята Слова, свята Кнігі», прысвечаны Дню беларускага пісьменства. Гэта мерапрыемства стала першым у рамках рэкламнага тыдня «Бібліятэка ў новым тысячагоддзі”, прысвечанага Дню бібліятэк.

У праграме:
-уступнае слова да Дня бібліятэк;
- рэклама паслуг цэнтральнай бібліятэкі;
- бібліяграфічны агляд “Свята духоўнасці, друку, культуры”;
- відэаролік «Летопись праздника День белорусской письменности»;
- інтэрактыўная гульня «Свята беларускага пісьменства”.

Удзельнікі мерапрыемства, вучні СШ №8 г. Кобрына, таксама пазнаёміліся са спектрам паслуг цэнтральнай раённай бібліятэкі, з прафесіяй бібліятэкара.

*ЦБ.52 чал.*

**10 верасня**

Акцыя - прэзентацыя "Чытай кожны дзень" у фае ДУА"Гарадзецкі дзіцячы сад - сярэдняя школа". Падчас мерапрыемства бібліятэкары зрабілі рэкламу паслуг Гарадзецкай сельскай бібліятэкі. Навучэнцы і выкладчыкі азнаёміліся з літаратурай і электроннымі дакументамі з бібліятэчнага фонда. Прысутныя прынялі актыўны ўдзел у экспрэс-апытанні “Якія эмоцыі вы выпрабоўваеце пры наведванні бібліятэкі?”, падзяліліся сваімі водгукамі пра працу бібліятэкі і яе супрацоўнікаў, пакінулі свае пажаданні.

*Гарадзецкая СБ, 79чал.*

**12 верасня**

Літаратурная латарэя “Книжные лабиринты» для дзяцей 2-5 класаў. Дзеці з захапленнем удзельнічалі ў бяспройгрышнай латарэі. Падказкамі на пытанні з’яўляліся самі кнігі, якія знаходзіліся на кніжнай выставе “Мой друг –кніга “.

*Лелікаўская СБ, 14 чал.*

**15 верасня**

Дні адкрытых дзвярэй «Для юных книгалюбаў наша хата адкрыта заўсёды». Увазе дзяцей прадстаўлены: экскурс-вандраванне па бібліятэцы, прагляд лялечных спектакляў «Як Заяц-Хваста захацеў стаць чытачом», «Прагная вожычыха» і конкурсно-гульнявая праграма.

*ДБ, 22 чал.*

**16 верасня**

Віктарына для моладзі “Ці лёгка быць маладым”. На віктарыну была запрошана былая ўдзельніца будаўніцтва БАМа Фогель Наталля Віктараўна. Яна падзялілася з сучаснай моладдзю ўспамінамі пра будаўніцтва БАМа, пра той час, калі моладзь па закліку сэрца ехала на будаўніцтва “будоўлі века”. Вучні 10-11 класаў адказвалі на пытанні віктарыны.Удзельнікі мерапрыемства абменьваліся думкамі, праблемамі, з якімі сутыкаецца сучасная моладзь.

*Лукская СБ. 25 чал.*

**16 верасня**

Гадзіна шчырай размовы “Кніга і я” для дзяцей пачатковых класаў. Праведзены экскурс у гісторыю развіцця бібліятэк Беларусі. На мерампрыемстве дзеці з захапленнем абмярковывалі і рэкламавалі прачытаныя кнігі. Асаблівую ўвагу у дзяцей выклікала выстава дзённікаў летняга чытання.

*Залеская СБ, 15 чал.*

**16 верасня**

Рэкламны Тыдзень пачаўся з Дня адкрытых дзвярэй. Дзеці і сталыя пазналі шмат новага і цікавага пра бібліятэку, бібліятэчных паслугах, пазнаёміліся з новымі паступленнямі і выставамі. Для дзяцей правялі цікавае і пазнавальнае вандраванне ў гісторыю стварэння кнігі "Ад папірусу да гаджэта". Бібліятэкары прадставілі фотавыставу "Чытаем разам", дзе былі прадэманстраваны нечаканыя і пацешныя кадры, знятыя ў сценах бібліятэкі, на якіх многія з радасным здзіўленнем выявілі сябе. Для чытачоў былі падрыхтаваны вясёлыя віктарыны, цікавыя конкурсы, у якіх усе ахвотнікі маглі прадэманстраваць свае веды ў самых розных абласцях: ад літаратуры да кібернетыкі. У праграме Тыдня рэкламы бібліятэкі прайшоў Дзень чытацкага самакіравання. Кожны мог паспрабаваць сябе ў ролі бібліятэкара, бібліёграфа ці краязнаўцы. Дарослыя і дзеці абслугоўвалі чытачоў, на хуткасць расстаўлялі літаратуру ў фондзе, рабілі бібліяграфічнае апісанне артыкулаў .

*Дзівінская СБ, 25 чал.*

**17 верасня**

Пазнавальная гадзіна “Русской речи Государь по прозванию Словарь» для вучняў 4-6 класаў.Дзеці пазнаёміліся з жаццёвым і творчым шляхам С.І..Ожэгава і яго галоўнай працай “Словарь русского языка” ў форме слайд –прэзентацыі. Вучні з захапленнем знаходзілі тлумачэнне азначанных слоў.

*Лукская СБ,20 чал.*

**20 верасня**

Свята "Заўсёды адкрыта дзверы дабру." Дзеці з цікавасцю слухалі прыказкі і прымаўкі пра дабро, адгадвалі загадкі, гулялі ў гульні. Паглядзелі спектакль лялечнага тэатра "Пра добрага жураўліка", інсцэніроўку "Ветлівае слова".

*Балоцкая СБ, 35 чал.*

**23 верасня**

Пасяджэнне клуба "Брыганціна" "Восеньскі марафон з добрай кнігай" . Падчас мерапрыемства дзеці здзейснілі вандраванне па станцыях " Літаратурная", "Дарункі восені", "Знаўцы лясных таямніц”, "Восеньскія месяцы", "Гульнявая", падчас якога чыталі вершы, адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарын, удзельнічалі ў гульнях і эстафетах. Пасяджанне завяршылася сяброўскім чаяпіццем.

Г*арадзецкая СБ, 21 чал.*

## Іншыя мерапрыемствы

**11 верасня**

Раённы семінар бібліятэчных супрацоўнікаў “ Работа бібліятэк у перыяд перадвыбарчай кампаніі”, дзе адбылася прэзентацыя метадычнага зборніку ў дапамогу сельскім бібліятэкам “Дапамагчы зрабіць правільны выбар”.

*ЦБ, 55 чал.*

**22 верасня**

У інтэрнаце палітэхнічнага каледжа праведзена гадзіна краязнаўства «Старажытны па ўзросце, але вечна юны горад", адбылося завочнае знаёмства іншагародніх навучэнцаў 1 курсу каледжа з горадам Кобрынам. Цікавым фактам стала прыцягненне непасрэдна саміх навучэнцаў да правядзення мерапрыемства. Так, навучэнец 1 курсу палітэхнічнага каледжа Яўгеній Пекач стаў адным з вядучых.

У праграме мерапрыемства:

- завочнае знаёмства з цэнтральнай раённай бібліятэкай г.Кобрына «Тут пануе ведаў культ»;
- відэаролік рэкламных паслуг бібліятэкі;
- відэапрэзентацыя «Горад старажытны, горад малады»;
- літаратурна-музычная кампазіцыя «І легенды сівой даўніны, і сучасная пленная праца".

*ЦБ, 46 чал.*

.

Выканаўца:
Бібліятэкар 1 катэгорыі
Легацюк Л.В.
Тел. 2-36-81